Библиотека АН БССР

Смерць нямецкім акупантам!

ПРАЧЫТАЙ І ПЕРАДАЙ ДРУГОМУ

# ЧЫРВОНЫ ПАРТЫЗАН

ОРГАН КАРЭЛІЦКАГА РАЙКОМА КП(б) БЕЛАРУСІ

№ 8 Аўторак, 25 красавіка 1944 г.

ТАВАРЫШЧЫ!

Памятайце, што мабілізацыя, якую праводзяць немцы пад шырмай „рады", накіравана на фізічнае вынішчэнне беларускага народа.

Усімі сіламі і сродкамі зрывайце гэты крывавы план гітлераўцаў. Скрывайцеся, не з'яўляйцеся на зборныя пункты. Ідзіце пад абарону партызан. Уступайце ў рады партызан.

## Да насельніцтва часова акупіраваных нямецкімі захопнікамі раёнаў Савецкай Беларусі

Ад Савета Народных Камісараў Беларускай ССР, Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР і Цэнтральнага Камітэта КП(б) Беларусі

# ЗВАРОТ

ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЧЫ!

Рабочыя і сяляне, усе працоўныя часова акупіраваных нямецкімі захопнікамі раёнаў Савецкай Беларусі!

Над магутнымі ўдарамі доблеснай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, кіруемай Вярхоўным Галоўнакамандуючым Маршалам Савецкага Саюза таварышам СТАЛІНЫМ, гітлераўскія полчышчы адкатваюцца ўсё далей на захад, несучы велізарныя страты ў тэхніцы і жывой сіле. Чырвоная Армія прайшла з баямі на захад месцамі да 2 тысяч кіламетраў. Амаль поўнасцю вызвалена ад нямецкіх захопнікаў Савецкая Украіна. Ідзе масавае выгнанне гітлераўцаў з прадзелаў нашай роднай Беларусі. Надыходзяць радасныя дні вызвалення ўсёй Савецкай Беларусі з-пад гнёту нямецкіх катаў і разбойнікаў. Ужо амаль поўнасцю вызвалены ад нямецкіх захопнікаў Палеская і Гомельская вобласці, вызвалена многа раёнаў Магілеўскай і Віцебскай абласцей. Пачалося вызваленне Савецкай Малдавіі і Прыбалтыйскіх Савецкіх Рэспублік.

26 сакавіка 1944 года гераічная Чырвоная Армія адзяржала бліскучую славную перамогу. Громячы тэхніку і жывую сілу ворага і развіваючы наступленне, войскі Чырвонай Арміі выйшлі на Дзяржаўную граніцу СССР. Блізак дзень, калі ўся наша Савецкая зямля будзе поўнасцю ачышчана ад гітлераўскай нечысці.

Больш двух з паловай год нямецкія душагубы цярзаюць савецкую Беларусь. Няма такога зладзейства, перад якім асталяваліся-б крывавыя нямецка-фашысцкія каты. Немцы зверскі забілі сотні тысяч ні ў чым непавінных людзей. Яны спальваюць нашых людзей, напаўняюць калодзежы трупамі нашых дзяцей, яны атручваюць насельніцтва, заганяюць яго на мінныя палі і ўзрываюць там, мораць людзей голадам ў канцэнтрацыйных лагерах, гоняць у Германію, дзе народ гіне на катаржных работах.

Нямецкія захопнікі спальваюць беларускія гарады і сёлы. Яны пакрылі Беларусь руінамі, шыбеніцамі і магілкамі.

Адчуваючы свой прадсмертны час і ведаючы, што ім няма прашчэння за ўсе крывавыя злачынствы, нямецкія звяры канчаткова асатанелі. Цяпер яны задумалі новы план страшэнных злачынстваў супроць беларускага народа. Яны аб'явілі мабілізацыю мужчынскага насельніцтва Беларусі.

Нямецкія разбойнікі хочуць шляхам мабілізацыі сабраць найбольш здаровае мужчынскае беларускае насельніцтва, каб яго затым знішчыць. Для гэтага яны ў многіх месцах Беларусі і ў Польшчы ўстроілі лагеры смерці, куды заганяюць тысячамі сабраных пад рознымі прадлогамі людзей, у тым ліку па „мабілізацыі", і тысячамі штодзённа знішчаюць голадам, ці душаць газамі і потым спальваюць. Вось напрыклад, 22 сакавіка 1944 года, у вёсцы Азарычы, Палескай вобласці, наступаючыя войскі Беларускага фронта пад камандаваннем генерала арміі тав. Ракасоўскага адбілі ў немцаў такі лагер смерці, у якім было заключана 33.434 чалавекі беларускага насельніцтва. Людзі знаходзіліся пад адкрытым небам галодныя, абарваныя, голыя. Да дня вызвалення ў гэтым лагеры было ўжо больш 900 трупаў савецкіх грамадзян, памёршых ад голаду і замёрзшых. Дзесят-

(Працяг на 2-й стар.)

экр 3225



# Да насельніцтва часова акупіраваных нямецкімі захопнікамі раёнаў Савецкай Беларусі

## Аканчанне звароту

(Пачатак на 1-й стар.)

кі тысяч жанчын, дзяцей і старыкоў былі кінуты на мучыцельную смерць, ад якой іх выратавала наша доблесная Чырвоная Армія.

Такую ўчасць нямецкія каты рыхтуюць усім зганяемым на мабілізацыі.

Нямецкія захопнікі не насмелі ад сябе абвясціць мабілізацыю. Гэтыя каты ведаюць, што яны акружаны ўсенароднай ненавісцю, яны ведаюць — ні адзін чалавек у Беларусі нямецкім загадам не падпарадкоўваецца. Каб абмануць хоць каго-небудзь з беларусаў нямецкае гестапо прыдумала шырму і назвала гэту шырму „радай". Так званая „рада" падпісвае паперкі, якія састаўляе нямецкае гестапо.

Два з паловай годы шукалі гітлераўцы ў Беларусі якога-небудзь здрадніка, які-б служыў для іх шырмай і падпісваў-бы загады ад якой-небудзь „рады", ці „самапомачы", ці яшчэ ад каго-небудзь. Але ніхто з беларускіх людзей не пайшоў на службу да немцаў. Тады яны прывезлі з Берліна Астроўскага. Хто ён? Гэта слуцкі памешчык, потым дзенікінскі афіцэр. Пасля разгрому Дзенікіна ўцёк у Польшчу і паступіў на службу ў дэфензыву — польскую тайную паліцыю, якая зрабіла яго дэпутатам польскага сейма. Гэты „дэпутат" прадаваў Польшчу Германіі, потым адкрыта перайшоў на бок Германіі. Вось зараз яго і прывезлі з берлінскага звярынага пітомніка, каб ён узначаліў сабою „раду" і дапамагаў немцам знішчаць беларускае насельніцтва.

ТАВАРЫШЫ!

Не паддавайцеся ні на якія нямецкія правакацыі. Не давайце сябе ашукаць. Памятайце, што мабілізацыя, якую праводзяць немцы пад шырмай „рады" накіравана на фізычнае вынішчэнне беларускага народа.

Усімі сіламі і сродкамі зрывайце гэты крывавы план гітлераўцаў. Скрывайцеся, не з'яўляйцеся на зборныя пункты. Ідзіце пад абарону партызан. Уступайце ў рады партызан. Помсціце нямецкім людаедам за пралітую кроў і слёзы беларускага народа, за знішчэнне нашых сёл і гарадоў, за разбурэнне і разрабленне хатніх ачагоў, за забойства ні ў чым непавінных жанчын, дзяцей, старыкоў, за ўгон нашых братоў і сясцёр у нямецкае рабства.

ПАРТЫЗАНЫ І ПАРТЫЗАНКІ!

Дапамагайце насельніцтву ўхіляцца ад нямецкай мабілізацыі. Растлумачвайце ўсім, што абвешчаная гітлераўцамі мабілізацыя — новы крывавы план фізічнага вынішчэння беларускага народа. Абараняйце наш народ усімі сіламі і сродкамі. Клічце, арганізоўвайце народ на ўзмацненне ўсенароднай партызанскай барацьбы з нямецкімі захопнікамі. Знішчайце каманды, якія зганяюць народ на зборныя пункты, грамце зборныя пункты. Нападайце на штабы і гарнізоны праціўніка. Грамце яго тылы, разбурайце яго камунікацыі і сувязь. Пазбаўляйце яго магчымасці падцягваць рэзервы да фронта. Дзейнічайце смела і рашуча. Ведайце, што вам на выручку ідзе Чырвоная Армія.

Зараз перамога блізка, як ніколі. Чырвоная Армія знаходзіцца ля граніцы Румыніі, яна ўступіла ў Карпаты. Наступленне Чырвонай Арміі ўсё нарастае.

Людскія рэзервы Германіі вычарпаны.

Авіяцыя нашых саюзнікаў бамбіць немцаў днём і ноччу. Італія кінула Германію і перайшла на бок саюзнікаў. Румынія, Венгрыя і Фінляндыя шукаюць шчыліны, куды-б западзці і ўнікнуць ад адказнасці, якую яны непазбежна павінны панесці разам з Германіяй.

Гераічная Чырвоная Армія ідзе да вас. Яна нясе беларускаму народу збаўленне, свабоду, радаснае і шчаслівае жыццё.

Час перамогі блізак. Перамога будзе за намі!

Няхай жыве гераічны беларускі народ!

Няхай жыве наша слаўная непераможная Чырвоная Армія!

Няхай жывуць нашы адважныя партызаны і партызанкі!

Няхай жыве свабодная Савецкая Беларусь!

Няхай жыве наш правадыр, арганізатар перамог, Маршал Савецкага Саюза таварыш СТАЛІН!

Помста і смерць нямецкім захопнікам!

Старшыня Савета Народных Камісараў Беларускай ССР П. ПАНАМАРЭНКА

Старшыня Прэзыдыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР Н. НАТАЛЕВІЧ

Сакратар ЦК КП(б) Беларусі П. КАЛІНІН

Рэдкалегія.